# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№9 (280)
верасень 2025

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”


**У НУМАРЫ:**

**5 спосабаў падтрымаць “Будзьма беларусамі!”**

Культурна-асветны партал “Будзьма беларусамі!” – скарбонка беларушчыны. Штодзень каманда стварае і пашырае беларускае праз наш сайт, ютуб-канал і сацыяльныя сеткі. Калі вам падабаецца тое, што робіць “Будзьма беларусамі!”, падтрымайце нас, і мы зможам болей.

Старонка 2


НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ





# ЗГУРТАВАННЮ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ “БАЦЬКАЎШЧЫНА” – 35!

Сёння Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” адзначае свой юбілей. І мусім прызнаць: з усіх перыядаў нашай ужо не такой малой гісторыі гэты, бадай, самы складаны. Але мы ёсць, мы побач з вамі, мы працягваем працаваць.

Нашы мэты застаюцца нязменнымі: дапамагчы беларусам у свеце і на Радзіме захоўваць сваю нацыянальную ідэнтычнасць, наладжваць кантакты паміж супольнасцямі, аб’ядноўваць беларусаў у адну моцную сям’ю. Змяніліся толькі ўмовы, у якіх мы працуем: за апошнія чатыры гады яны сталі вельмі складанымі.

35 гадоў таму, 10 верасня 1990 года, устаноўчая канферэнцыя “Бацькаўшчыны” праходзіла на ўздыме хвалі, што атрымала назву Нацыянальнага Адраджэння, літаральна на парозе нараджэння незалежнай беларускай дзяржавы. Тады яшчэ не існавала Рэспублікі Беларусь, але ўжо была прынятая Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце, а беларуская мова мела статус адзінай дзяржаўнай. Сёння ж усё часцей і гучней гучаць трывожныя словы пра пагрозу страты суверэнітэту, а праваабаронцы фіксуюць беспрэцэдэнтную дыскрымінацыю беларускай мовы і культуры на яе ўласнай зямлі.

Першы з’езд беларусаў свету, арганізаваны “Бацькаўшчынай” праз некалькі гадоў пасля стварэння арганізацыі, адкрыў магчымасць тысячам людзей упершыню за многія дзесяцігоддзі наведаць Радзіму і распачаць новы культурны і палітычны дыялог паміж дыяспарай і Бацькаўшчынай. Аднак сёння Беларусь перажывае найбуйнейшую хвалю вымушанай эміграцыі ў сваёй гісторыі. Колькасць тых, хто пакінуў краіну, настолькі вялікая, што ўлады баяцца назваць сапраўдныя лічбы.

Адна з галоўных задач “Бацькаўшчыны” – наладжваць сувязі паміж дыяспарай і Беларуссю – цяпер амаль немагчымая, бо “Бацькаўшчына” сёння не можа працаваць у Беларусі. У 2021 годзе Згуртаванне было ліквідавана ўладамі. Але гэта не прычына для адчаю. Бо мы не маем права страціць беларускую дзяржаву. Таму працягваем сваю дзейнасць за межамі Беларусі, шукаем новыя фарматы працы, новыя шляхі для аб’яднання беларусаў свету. Мы глядзім у будучыню з верай і адчуваннем адказнасці.

У гэты юбілейны дзень мы шчыра дзякуем усім сябрам і паплечнікам, якія былі з намі ў розныя часы. Дзякуючы вашай падтрымцы і салідарнасці мы здолелі зрабіць столькі важнага і маем сілы рухацца далей. Верым: лепшае для Бацькаўшчыны – і малой, і вялікай – яшчэ наперадзе.

Жыве Беларусь!

ЗБС “Бацькаўшчына”

“Будзьма беларусамі!”

# 5 СПОСАБАЎ ПАДТРЫМАЦЬ “БУДЗЬМУ”

Культурна-асветны партал “Будзьма беларусамі!” – скарбонка беларушчыны. Штодзень каманда стварае і пашырае беларускае праз наш сайт, ютуб-канал і сацыяльныя сеткі. Калі вам падабаецца тое, што робіць “Будзьма”, падтрымайце нас, і мы зможам болей.




Калі вы не маеце магчымасць аказаць фінансавую падтрымку, распавядзіце пра “Будзьму” сябрам і знаёмым. Гэта таксама вельмі каштоўна.

**Вось 5 спосабаў, як можна падтрымаць “Будзьму”**

Падтрымлівайце нас, толькі калі вы знаходзіцеся за мяжой і для вас гэта бяспечна. Калі вы ў Беларусі – не рызыкуйце для нас.

1. Набыць кубачак кавы на платформе ko-fi.com.

Можна набыць адзін кубачак альбо аформіць падпіску на штомесячную падтрымку.

2. Зрабіць данат праз PayPal: https://www.paypal.com/paypalme/budzma

3. Пералічыць ахвяраванне наўпрост на банкаўскі рахунак у Літве:

Нумар рахунка: LT874010051003596075

Банк: Luminor Bank AS Lithuanian branch, SWIFT AGBLLT2X

Адрас банка: Konstitucijos pr. 21A, 03601 Vilnius, Lietuva

Атрымальнік плацяжу: VSJ Bukim kartu (“Будзьма разам”)

Код арганізацыі:304102906 (аналаг нашага УНП)

Прызначэнне плацяжу: Donation

4. Пералічыць ахвяраванне на банкаўскую картку:

4220 7301 7151 8283

дзейсная да 11/28

VSJ Bukim kartu

Прызначэнне плацяжу: Donation

Гэты спосаб, як і папярэдні, зручныя тым, што не патрабуюць рэгістрацыі ў нейкіх сэрвісах, і рэдакцыя “Будзьма беларусамі!” атрымае цалкам усю суму.

5. Замовіць рэкламу на Budzma.org

Калі вы маеце свой бізнес за мяжой, вы можаце замовіць рэкламу сваіх тавараў або паслуг на нашым сайце і ў сацсетках. Каб даведацца болей пра рэкламныя магчымасці, напішыце нам на емэйл razam@budzma.org

Любая ваша дапамога для нас вельмі каштоўная!

**Што мы робім і чаму гэта важна**

“Будзьма беларусамі!” пачыналася як шырокая культурна-асветная кампанія ў Беларусі ў 2008 годзе. Сёння мы вымушана працуем з замежжа, але працягваем пісаць пра Беларусь і беларусаў.

Кожны дзень мы распавядаем пра важныя падзеі беларускага грамадскага і культурнага жыцця, публікуем аўтарскія калонкі, інтэрв’ю з беларускімі творцамі, адкрываем таямніцы нашай гісторыі, знаёмім з цікавосткамі пра беларускую мову, літаратуру, кіно, мастацтва.

“Будзьма беларусамі!” – гэта таксама ютуб-каналз унікальнымі відэапраектамі, дзе мы распавядаем праўду пра невядомыя старонкі гісторыі ў праекце “Трызуб і Пагоня”, знаёмім са шляхецкай культурай у праекце “Сармат”, разбураем стэрэатыпы пра Беларусь і беларусаў у перадачы “Хрусь і папалам!” ды шмат чаго яшчэ.

А на дзіцячым ютуб-канале “Будзьма дзецям” – кантэнт для маленькіх беларусікаў і беларусачак – казкі, спектаклі, адукацыйныя перадачы. Усё па-беларуску з любоўю і клопатам!

Таксама мы стварылі тэлеграм-бот афішу “Будзьма разам!”, каб вам было прасцей сачыць за беларускімі мерапрыемствамі ў сваім горадзе і па ўсім свеце.

Адным словам – мы ствараем і пашыраем беларускае дзеля нашай і вашай свабоды.

Калі і для вас беларушчына – падмурак незалежнасці, як і для нас, падтрымайце каманду партала budzma.org, і мы зможам болей!

Кожны ваш унёсак мае значэнне!

Будзьма беларусамі і будзьма разам!

budzma.org

навіны

# У ФРАНКФУРЦЕ-НА-МАЙНЕ З’ЯВІЦЦА ПАМЯТНАЯ ШЫЛЬДА ВАСІЛЮ БЫКАВУ

Раённая рада №1 нямецкага Франкфурта-на-Майне аднагалосна прагаласавала за ўсталяванне памятнай шыльды ў гонар беларускага пісьменніка Васіля Быкава.



У 1998 годзе Быкаў быў вымушаны пакінуць Радзіму з-за крытыкі рэжыму Лукашэнкі. У межах ініцыятывы “Горад прытулку” ён пражываў у Франкфурце-на-Майне ў 2001 і 2002 гадах. Цяпер раённая рада ухваліла ўсталяванне памятнай шыльды ў парку Bockenheimer Anlage, побач з домам, дзе жыў пісьменнік.

Перад галасаваннем сябры арганізацыі “Razam” Яўгенія Гукава і Алесь Маісеенка прэзентавалі дэпутатам Франкфурта жыццёвы шлях і творчасць гэтага выбітнага пісьменніка, паведамляе ініцыятыва “Razam”.

Ініцыятыва выказвае падзяку ўсім дэпутатам, якія зрабілі магчымым рэалізацыю гэтай ідэі. Асобная падзяка – суініцыятарам Міхаілу Рубіну, Тацццяне Трафімавай і дэпутату Штэфану Кортэ (Свабодная дэмакратычная партыя Германіі), якія падаў заяўку.

nashaniva.com

навіны

# СТАТКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ Ў БЕЛАРУСЬ, ДАШКЕВІЧ ВЫКАЗАЎ ТАКІ Ж НАМЕР

Мікалай Статкевіч, вызвалены 11 верасня ў ліку 52 палітвязняў, адмовіўся выязджаць у Літву. Некалькі гадзін ён правёў на беларуска-літоўскай мяжы.

Паплечнік Статкевіча па партыі "Народная грамада" Яўген Вільскі спрабаваў угаварыць палітыка перайсці ў Літву. Аднак Статкевіч заявіў, што сам будзе вырашаць свой лёс.

"Было некалькі спробаў яго ўгаварыць: і амерыканскія дыпламаты, і жонка, і яшчэ нейкая жанчына. Мне далі пяць хвілін, гэта была апошняя спроба. Завялі туды, гэта адбывалася ў Беларусі, на памежным пераходзе. Ён адмовіўся. Ён лічыць, што Лукашэнка не вырашае яго лёс", – перадае выданне "Зеркало" словы Вільскага.


Мікалай Статкевіч на беларуска-літоўскай мяжы

Ад мяжы Статкевіча некуды павезлі людзі ў масках, якія ўвесь час чакалі непадалёк.

Астатнія палітвязні выехалі ў Вільню.

Былы лідар "Маладога фронту" Зміцер Дашкевіч у каментары Радыё Свабода таксама выказаў намер вярнуцца ў Беларусь: "Я вельмі люблю сваю сям'ю. Дзеля іх я ўсё гэта вытрымаў. Дзеля іх я вярнуўся. І канечне, у мяне вельмі супярэчлівыя пачуцці, што ёсць воля, а няма сям'і. Калі ім не дазволяць да мяне прыехаць, уз'яднацца, я паеду ў Беларусь назад".

euroradio.fm

# Павел Мажэйка: НАШАЯ МІСІЯ – ЗРАБІЦЬ БЕЛАРУСЬ НАРМАЛЬНАЮ КРАІНАЮ

Журналіст, грамадскі актывіст, былы палітычны вязень Павел Мажэйка, які выйшаў на волю 11 верасня разам з іншымі палітычнымі вязнямі з дапамогаю ЗША, апавёў пра першыя прыемныя ўражанні на волі, а таксама падзяліўся думкамі пра становішча палітзняволенага палітыка Міколы Статкевіча, якога таксама мелі вывезці ў Літву, але той адмовіўся.

Павел Мажэйка дасюль не можа прызвычаіцца да яскравых колераў:

"Турма – гэта больш пра чорна-белае. Таму з захапленнем назіраю за каляровай мітуснёю".

На пытанне, што смачнага журналіст паспеў паесці на волі, адказвае: галоўнае, з кім есці, а не што.

"Калі ты маеш магчымасць абняць родных, сям'ю, гэта найважнейшая, поўнае розных вітамінаў і амінакіслотаў смаката. Гэта я ўжо засведчыў, перажыў. Спрабую кожны дзень падсілкоўваць сябе добрымі ўражаннямі і глядзець наперад, абсалютна разумеючы, што нашая місія – а я мяркую, што чалавек тады чалавек, калі мае нейкую місію – зрабіць Беларусь нармальнаю краінаю, дзе ніхто не мусіць сядзець за свае погляды, не мусіць уцякаць з краіны і быць гвалтоўна вывезены, і павінен мець права выбару", – кажа Павел Мажэйка.

Ён таксама падзяліўся думкамі пра стан Міколы Статкевіча, які быў вызвалены разам з ім, але адмовіўся ехаць у Літву і вярнуўся ў Беларусь. Верагодна, Статкевіч ізноў за кратамі.

"Там чалавек абсалютна бяспраўны, а калі ты палітзняволены, то ў некалькі разоў больш. Не хачу дадаваць трагізму, але разумею, што адміністрацыя гэтай установы можа рабіць з Міколам усё, што заўгодна. Спадзяемся, ён пад наглядам, забяспечаны медычнаю дапамогай, але трэба разумець, што можа быць усё", – дадаў былы палітвязень.




Ён распавёў, што пакаранні ў месцах зняволення могуць быць з абсалютна надуманых прычынаў. Напрыклад, Мажэйка неяк трапіў у ШІЗА, калі супрацоўнік калоніі заявіў, што Павел не павітаўся, хоць гэта было няпраўдаю.

Паўла Мажэйку затрымалі ў Беларусі 30 жніўня 2022-га і пакаралі 6 гадамі зняволення паводле артыкулу 361-4 КК ("спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці"). Быў вызвалены пасля візіту дэлегацыі ЗША ў Мінск 11 верасня разам з яшчэ 51 палітвязнем. Аднак Мікола Статкевіч адмовіўся ад дэпартацыі і вярнуўся ў Беларусь.

nashaniva.com

# Алесь Міхалевіч: "ГЭТА НЕ ДЭПАРТАЦЫЯ, А ПРЫМУСОВАЕ ВЫДВАРЭННЕ"

Паказаць, што дакладна чалавек у Беларусь ужо не вернецца. Якія юрыдычныя аспекты вызвалення беларускіх палітвязняў у рамках дамоўленасцяў з ЗША? Нагадаем, 11 верасня вызвалілі 52 палітвязні з турмаў Беларусі, сярод іх – 38 грамадзян Беларусі. Іх прымусова вывезлі з Беларусі ў Літву. Палітык Мікалай Статкевіч адмовіўся пакідаць Беларусь.

Гэта не дэпартацыя, прымусовае выдварэнне, падкрэслівае адвакат, сябра чэшскай калегіі адвакатаў Алесь Міхалевіч:

– Сваіх грамадзян дэпартаваць немагчыма, юрыдычна тут працэс дэпартацыі ніяк нельга ўключыць. Гэта якраз, я думаю, што адбылося з тымі замежнымі грамадзянамі, якіх вызвалілі. З імі якраз з вялікай доляй верагоднасці дэпартацыя была афармлена. Але што датычыць грамадзян Беларусі, гэта было проста прымусовае прымяненне сілы з davозам да мяжы і выкідваннем з краіны.

Зразумелая логіка рэжыму, пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі, без беларускага пашпарту такому палітвязню не магчыма вярнуцца. Для гэта іх і вывозяць з краіны, працягвае Алесь Міхалевіч.

– Яны баяцца падвышэння градусу ў грамадстве, баяцца таго, што гэта нейкім чынам можа спрацаваць на іншых, што тая старонка, якую яны даўно спрабуюць перагарнуць, якая ў іх не перагортваецца, я маю на ўвазе працэсы 2020 года, то гэта ўсё можа паўтарыцца. А для Лукашэнкі і яго людзей гэта ўсё з'яўляецца ў нейкім сэнсе страшным сном.

Зараз вызваленыя палітвязні ў працэсе атрымання часовых дакументаў у Літве. Многім патрэбная рэабілітацыя, псіхалагічная і медычная дапамога.

racyja.com

культура

# КІРАЎНІЦА ВОЛЬНАГА ХОРУ ТРЫМАЕ Ў ВАРШАВЕ ШКОЛУ МАСТАЦТВАЎ

Пасля пераезду ў Польшчу кіраўніца Вольнага хору Галіна Казіміроўская стварыла з калегамі школу мастацтваў. Выйшла месца, дзе спяваюць Вольскага і "Навібэнд", а Маляваныч вучыць іграць у тэатры.



### "Калі дзеці лепш разумеюць, хто яны такія і адкуль, яны больш адкрытыя да свету"

Галіна Казіміроўская апынулася ў Польшчы ў 2021-м. Акрамя яе, у Варшаву вымушана з'ехалі некаторыя спевакі з Вольнага хору.

Шмат хто з іх выехаў з краіны разам з дзецьмі, Галіна таксама перабралася ў замежжа з сям'ёй. Харысты бралі з сабой дзяцей на першыя рэпетыцыі ў Польшчы, і з часам прыйшла думка зладзіць для малых заняткі ўласнымі сіламі.

Галіна ўспамінае:

"Нашы дзеці не былі знаёмыя паміж сабой, ім было вельмі адзінока, а ў нас атрымалася суполка, дзе можна было знайсці сяброў. То-бок у пачатку наша мэта была больш сацыяльная – дапамагчы дзецям адаптавацца.

Так мы пачалі заняткі хору. Прыязджала ўсё больш беларусаў, да нас пачалі далучацца дзеці знаёмых, потым знаёмых знаёмых. У лютым 2022-га, калі мы пачалі збіраць дзяцей, іх у нас было 12, а калі разыходзіліся летам – каля 50".

Выкладчыкі таксама лёгка знайшліся. У эміграцыі, кажа Галіна, апынулася шмат дзеячаў культуры, і ім спатрэбілася месца, дзе можна было б захаваць сувязь са сваёй прафесіяй.

Так у школе пачалі працаваць, напрыклад, кампазітарка Вольга Падгайская, якая выкладае фартэпіяна і сальфеджыа, ці Васіль Драньќо-Майсюк, да якога можна прыйсці на літаратурна-тэатральныя заняткі.

Цяпер у гэтай варшаўскай школе тры дзіцячыя хоры. Ёсць заняткі па вакале, фартэпіяна і сальфеджыа, некалькі груп па тэатральным майстэрстве, у тым ліку тэатр-студыя, якой кіруе акцёр Аляксандр Ждановіч. Школе далі імя Міколы Равенскага – беларускага кампазітара і аўтара музыкі для гімна "Магутны Божа".

Галіна расказвае, што ў школу прыходзяць шмат падлеткаў:

"Па-першае, гэта дзеці з беларускамоўных сем'яў, для якіх вельмі важная падтрымка беларускасці. Таксама гэта дзеці і з рускамоўных сем'яў, якія адчуваюць, асабліва падлеткі, патрэбу вывучаць сваю ідэнтычнасць. Маўляў, я прыехаў з Беларусі, размаўляю з роднымі і сябрамі па-руску, а хто такі я сам?

На нашых занятках, якія збольшага ладзяцца па-беларуску, дзеці знаходзяць адказ на сваё пытанне аб ідэнтычнасці. Калі дзеці лепш разумеюць, хто яны такія і адкуль, яны робяцца больш упэўненыя ў сабе, і такія дзеці больш адкрытыя да свету, да камунікацыі з іншым народам".

Шмат дзяцей, якія прыйшлі ў школьны хор, ніколі да гэтага не спявалі і не наведвалі б такія заняткі, калі б не эміграцыя, лічыць Галіна. Але хор аказаўся для іх не проста супольнасцю спевакоў – ён даў ім магчымасць рабіць нешта разам і знаходзіць сяброў.

Галіна разважае, што для яе было важна зрабіць менавіта беларускую школу. Акрамя роднай мовы, гэта рэалізуецца і праз творы, якія вывучаюць і выконваюць вучні. Напрыклад, гэта песні гуртоў J:Морс, Nochy і Naviband, Лявона Вольскага.

Але важна памятаць пра баланс, лічыць Казіміроўская:

"Гэта не азначае, што мы сядзім толькі на беларускім матэрыяле, нібыта беларускае гета. Калі ў нас заняткі па спевах, мы спакойна спяваем і Баха ды Гендаля, і беларускія песні".

### "Для палякаў гэта проста праект пра культуру іншай краіны, і з чаго ім яго падтрымліваць?"

У школе займаюцца не толькі дзеці. Дарослыя могуць запісацца туды на заняткі па вакале, фартэпіяна і сальфеджыа, а з гэтага года яшчэ і на акардэон.

Галіна расказвае, што ўсё жыццё працуе з дарослымі, якія вырашылі паспрабаваць сябе ў музыцы. Гэта гісторыя пра тое, калі людзям нечага не хапае ў жыцці і хочацца атрымаць нешта большае, чым проста побыт і праца.

"Мне здаецца, што мастацтва – гэта такі элемент, без якога шмат у каго не складваецца адчуванне паўнавартаснага жыцця. Шмат [дарослых] да нас ходзяць, проста каб атрымаць тэрапеўтычны эфект, паспрабаваць сябе ў нечым і адпачыць.

Некаторыя ў дзяцінстве хацелі ісці ў музычную школу, а бацькі іх не аддалі, вырашылі, што лепш ім займацца, напрыклад, матэматыкай і англійскай. У дарослым узросце такія людзі гэта часам даганяюць і дасягаюць добрага ўзроўню. Яны не толькі прыходзяць на заняткі, але і ўдзельнічаюць у канцэртах, якія мы ладзім", – адзначае Казіміроўская.

Бывае, што чалавек у дзяцінстве займаўся музыкай, але пазней пайшоў па іншым шляху і вырас, да прыкладу, у праграмісты. Але дзіцячае хобі нагадвае пра сябе і з цягам часу можа прывесці такога чалавека зноў на заняткі. Галіна кажа, што шмат хто з людзей, якія прыходзяць да яе ў хор, былі харыстамі раней і не могуць ад гэтага адмовіцца, бо харавая справа ў нечым падобная да добрай залежнасці.

Як і шматлікія беларускія праекты замежжа, школа Равенскага змагаецца за сваю ўстойлівасць. У пачатку знаходзіць фінансаванне было лягчэй, але з часам давялося ўвесці ў школе клубныя ўнёскі. Цяпер жа школа цалкам пераходзіць на аплатную працу – інакш, кажа Галіна, няма за што існаваць.

Кіраўніца школы дзеліцца, што вельмі не хоча ператвараць школу ў камерцыйную арганізацыю:

"Мы трымаем ніжнюю планку па варшаўскіх цэнах, каб школа проста існавала. На гэтым праекце немагчыма зарабіць, проста трэба, каб ён выжываў".

Калі дзіця ходзіць на заняткі ў хоры, гэта каштуе 80 злотых на месяц (каля 19 еўра), заняткі адбываюцца двойчы на тыдзень – адзін занятак двухгадзінны, другі – гадзінны. Падобныя цэны на тэатральным кірунку. Калі гэта сальфеджыа, дзе групы мусяць быць маленькія, кошт можа быць і 100 злотых (каля 23 еўра). Па індывідуальных занятках адзінага кошту няма, ён можа складаць недзе ад 70 да 90 злотых за занятак (прыкладна 16-21 еўра).

Казаць пра фінансавую ўстойлівасць школы цяпер складана – у мінулым годзе школа працавала ў мінус. Калі не ўвесці аплату, школу давядзецца зачыняць, кажа Галіна.

Спадзявацца на падтрымку ад польскай дзяржавы не даводзіцца (яе прасцей атрымаць праектам, скіраваным на інтэграцыю ў польскае грамадства, а не стварэнне свайго асяродку):

"Наша дзейнасць не зусім адпавядае інтарэсам Польшчы. Нам важна захаваць беларускасць школы, падтрымаць беларусаў – людзей, якія плацяць у Польшчы падаткі, укладаюцца ў гэтую краіну. Мне здаецца, да іх таксама павінна быць увага.

Нам важна захоўваць тут, звонку краіны, беларускасць, бо ўнутры Беларусі будуецца рускі свет, і мы адчуваем адказнасць за захаванне твораў і імёнаў творцаў у эміграцыі. Дзейнасць школы робіцца прафесійнай, ставяцца спектаклі і запісваюцца дыскі – гэта прадукт, які мае культурную каштоўнасць".

Калі б была магчымасць закрыць частку выдаткаў школы праз падтрымку, Галіна б пакінула бясплатнымі заняткі па беларускай літаратуры і хор.

"Мне балюча, што некаторыя бацькі зараз могуць быць вымушаныя выбіраць, куды аддаць дзяцей. А ёсць сем'і, дзе двое, трое дзетак".

nashaniva.com

культура

# У ВІЛЬНІ ПАЧАЎ ПРАЦУ "МЫСЛЯРСКІ КЛУБ"

Тыдзень беларускай культуры праходзіў з 1 па 7 верасня ў віленскім Беларускім доме – у Цэнтры беларускай супольнасці і культуры, дзе таксама працуе Беларускі музей імя Івана Луцкевіча.



Чытач Свабоды (Courtesy Photo)

Альфрэдас Бумблаўскас, Андрэй Антонаў, Аляксей Ластоўскі, Сяргей Дубавец

Сёлета Тыдзень беларускай культуры ў Літве праводзілі трэці раз. У межах ягонай праграмы прайшло першае паседжанне "Мыслярскага клубу", адбыліся дзва майстар-класы, выступілі беларускія акторы Марына і Сяргей Здаранковы. У першы дзень тыдня адкрылі інтэрактыўную выставу "Літаратурны мапінг Вільні і Менску".

Кіраўніца Цэнтру Людвіка Кардзіс у інтэрв'ю "Радыё Свабода" сказала, што ў Беларускім доме гэтымі днямі пабольшала наведнікаў.

"Як па мне, усе імпрэзы былі вельмі цікавыя: адкрыццё літаратурнай выставы, майстар-класаў для дарослых і дзяцей „Маё імя ў трох алфавітах" і „Тут я пачуваюся дома". Асабліва адзначу першае паседжанне „Мыслярскага клубу". Гэта была наша даўняя ідэя – адкрыць такі „філасофскі салон", дзе абазнаныя людзі будуць абмяркоўваць пэўную актуальную праблему, а наведнікі змогуць пачуць размову ды ў ёй паўдзельнічаць. І вось адбылося першае паседжанне пад назвай „Мыслярскі клуб"", – расказала Людвіка Кардзіс.

### Пра супольную спадчыну – у "Мыслярскім клубе"

На першае паседжанне філасофскага салону арганізатары тыдня беларускай культуры запрасілі літоўскага гісторыка Альфрэдаса Бумблаўскаса і беларускага гісторыка Аляксея Ластоўскага, мадэратарам размовы быў літаратар Сяргей Дубавец. Тэмай размовы была агульная культурная спадчына.

"У тым ліку гаварылі пра так званы „літвінізм", наколькі ён распаўсюджаны, што ў ім небяспечнага, а што вартага ўвагі. Здаецца, наведнікі, якія сачылі за размовай, засталіся задаволеныя, потым адгукаліся вельмі актыўна. Таму будзем працягваць дзейнасць клубу, возьмемся за іншыя актуальныя тэмы. Тыдзень беларускай культуры карысны і гэтым, бо дазваляе зарыентавацца, куды ісці далей, як развівацца", – мяркуе Людвіка Кардзіс.

Тыдзень беларускай культуры арганізавалі актывісты беларускай супольнасці пры фінансавай падтрымцы Дэпартаменту нацыянальных меншасцяў Міністэрства культуры Літвы. Людвіка Кардзіс лічыць гэтую падтрымку вельмі важнай і сімвалічнай.

"Літоўцы бачаць патрэбу у тым, каб падтрымаць беларускую культуру. І гэта можна сказаць не толькі пра афіцыйныя ўстановы і арганізацыі, але і пра простых людзей. Бо аўдыторыя нашых імпрэзаў – не толькі беларусы, але і літоўцы, і мясцовыя палякі".

### Плянаў у Цэнтру шмат

Людвіка Кардзіс падзялілася і далейшымі планамі працы Цэнтру беларускай супольнасці і музея імя Івана Луцкевіча.

"Застаюцца нязменнымі нашыя і мэта, і асноўныя планы. Мэта – гэта папулярызацыя беларускай культуры і падтрымка ў Вільні беларускай супольнасці. Таму, як і раней, будзем праводзіць канферэнцыі, выставы малюнкаў, фотаздымкаў, прэзентацыі кніг, сустрэчы, канцэрты. Ад старых добрых звычаяў, якія сталі нашай візітоўкай за шмат гадоў, адмаўляцца не збіраемся. Працягвае працу бібліятэка, далей працуюць супрацоўнікі музея. Вось рэалізавалі выдатны праект перавядзення ў лічбу архіваў беларусаў-віленчукоў, перададзеных у музей. Праца праводзілася з дапамогай Брытанскай бібліятэкі", – расказала Людвіка Кардзіс.

Апрача таго, з верасня аднаўляе працу нядзельная беларуская школа пры Цэнтры беларускай супольнасці, для яе гэта будзе ўжо пяты навучальны год.

"Заяваў на навучанне дзетак пададзена крыху меней, за год частка беларусаў з Вільні з'ехала, мы гэта адчуваем, але наша праца працягваецца. Яна патрэбная беларускай будучыні, і мы ад гэтай місіі не адмовімся".

Працягваюцца і курсы беларускай, літоўскай і ангельскай моў.

На першым паверсе Беларускага дому ужо шмат гадоў месяцца выстава старажытнай керамікі і экспазіцыя, прысвечаная Івану Луцкевічу. Валанцёры Цэнтру супольнасці і культуры клапоцяцца пра пашырэнне экспазіцый.

"Цяпер мы хочам зрабіць сталую музейную экспазіцыю ў вялікай залі на другім паверсе, каб выставіць там экспанаты беларускай культурнай спадчыны, якіх назбіралі шмат, але паказаць іх наведнікам пакуль не можам. Ёсць такі план, але яго пакуль не ўдалося рэалізаваць з прычыны недахопу фінансаў. Таму шукаем фінансаванне і спадзяемся, што гэты план нарэшце рэалізуем", – сказала спадарыня Кардзіс.

### 10 тысяч еўра ахвяраванняў

Кіраўніца Цэнтру падкрэсліла, што сталага фінансаваня цэнтр не мае і функцыянуе на ахвяраванні, таму для яго вельмі важная актыўная падтрымка беларусаў, якія жывуць у Літве.

"Гэтым годам мы добрую суму ахвяраванняў сабралі праз сістэму пералічэння на дабрачыннасць 1,2% падаткаў, якая дзейнічае ў Літве. Мы аказаліся у лідарах сярод беларускіх арганізацый, якім людзі ахвяравалі частку падаткаў – каля 10 тысяч еўра. Для нас гэта была рэкордная сума. Асабліва прыемна, што мы першыя ў колькасці падаткаплатнікаў, якія гэтак вырашылі нас падтрымаць, Вельмі ўдзячныя нашым данатарам. Арэндную плату дзякуючы літоўскай дзяржаве мы плацім невялікую, але камунальныя паслугі значныя, таму гэтыя грошы – вельмі важны ўнёсак у нашу падтрымку".

svaboda.org

Беларускія мерапрыемствы па ўсім свеце @Budzma_razam_bot

навіны

# БЕЛАСТОК: АКЦЫЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ ДНЮ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ СЛАВЫ

У Беластоку 7 верасня прайшла акцыя, прысвечаная Дню беларускай вайсковай славы. Беларусы і сябры Беларусі сабраліся каля сквера Вольнай Бедарусі, каб узгадаць бітву пад Оршай і падкрэсліць яе значэнне для сённяшніх падзей.




Ля консульства Беларусі ў Беластоку прайшла акцыя, прысвечаная Дню беларускай вайсковай славы. З нагоды 511-й гадавіны бітвы пад Оршай у скверы Вольнай Беларусі сабралася каля 50 чалавек, у тым ліку і прадстаўнікі СМІ.

Пасля ўрачыстага “Мы выйдзем шчыльнымі радамі” першымі згадваюцца беларускія добраахвотнікі ва Украіне. Агучана гістарычнае значэнне бітвы пад Оршай для сучасных беларусаў. Выступоўцы казалі пра пераемнасць і пра актуальнасць змагання з усходняй навалай. Выступілі Ян Абадоўскі, Сяргей Верамеенка ды іншыя.

Да прысутных звярнуўся галоўны рэдактар Беларускага Радыё Рацыя Яўген Вапа, які адзначыў, што гісторыя Бітвы пад Оршай нагадвае пра адказнасць і стойкасць беларусаў у змаганні за сваю незалежнасць:

– І ў самой Беларусі і па-за межамі яе не ўсе могуць быць жаўнерамі, не ўсе могуць быць змагарнымі, тымі, хто непасрэдна ваюе, але кожны, хто думае па-беларуску, хоча дэмакратычнай Беларусі, – гэта менавіта той ваяр, які заўсёды будзе абараняць імя і славу беларуса і Беларусі.

Каб ваяваць за незалежнасць, трэба думаць па-беларуску. Не ўсе могуць быць ваярамі, але кожны, хто марыць пра дэмакратычную Беларусь, ужо ваяр. Зараз шмат выклікаў, таму важна сама дапамога. Зараз беларускі народ вельмі раз’яднаны. Ёсць тыя, хто пайшоў ваяваць на расейскі бок. Але Беларусь мацней за маскоўскую прапаганду і інтарэсы. Можам і пераможам!

Слова ўзяў прадстаўнік украінскай дыяспары ў Беластоку Антон Галавач. Ён кажа пра супольную спадчыну бітвы пад Воршай для беларусаў і ўкраінцаў. Гучыць спадзеў на абрыванне расейскай імперыі, і пераход да дэмакратычнага свету, дзе людзі не будуць гінуць, каб проста жыць.

Да прысутных звяртаецца кіраўнік Клуба гістарычнай рэканструкцыі Invictus 1863 Васіль Калач.

Кажа актывіст Сяргей Верамеенка: Ці ўспомняць нас нашчадкі праз 500 гадоў, як і мы ўспамінаем герояў бітвы пад Оршай? Беларускія ваяры змагаюцца ва Украіне, мы падтрымліваем палітвязняў. А ворагі падкідваюць нам нагоды для спрэчак, але гэта павінна быць паміж намі, а ўсе высілкі павінны быць кінуты на барацьбу з ворагамі.

Удзельнікі акцыі падкрэсліваюць, што акцыя адбываецца непадалёк ад беларускай мяжы. І варта памятаць, што вайна працягваецца. Як дзіця, свабода нараджаецца ў крыві. Перамога будзе абавязкова!

Кожны мог выказацца падчас вольнага мікрафону.

Удзельнікі акцыі правялі паралелі паміж падзеямі 1514 года і сучаснасцю.

– Менавіта гэтая бітва на вякі сфармавала наш рух, нашае імкненне, нашае развіццё як нацыі.

– Гэта дата падкрэслівае важнасць нашых сяброў, такіх як украінцы, палякі, літоўцы. Таму што мы ўсе разам ваявалі супраць нашага агульнага ворага.

– Бітва пад Оршай – важная перамога. Зараз нічога не мяняецца, зноў мусім разам ваяваць.

– Сёння беларусы працягваюць справы продкаў – змагаюцца супраць расейскіх акупантаў ва Украіне.

– Хлопцы і дзяўчаты, я здымаю перад вамі шапку і станаўлюся на калена, вы героі, вы наш гонар і годнасць, дзякуй вам ад усяго свайго сэрца.

– Пажадаць выжыць перадусім. Пажадаць, каб яны як найхутчэй вярнуліся дамоў, каб перамовы прывялі прынамсі да спынення агню.

На дзвярах Консульства вісіць абвестка з памылкай: “Серада – непрымальны дзень”. Веданне мовы лукашэнкаўскімі чыноўнікамі як заўсёды не на вышыні.

Абвешчана хвіліна маўчання ў памяць усіх беларусаў, якія загінулі за Беларусь.

Саму акцыю ахоўвае нарад паліцыі, ля яго знаходзяцца зацікаўленыя, якія не гатовы адкрыта далучыцца да акцыі.

Акцыя ў Беластоку стала часткай шырэйшых святкаванняў, якія праходзяць у розных краінах, дзе беларуская дыяспара ўшаноўвае Дзень беларускай вайсковай славы.

racyja.com

# КІЕЎ: МАЛЕБЕН І ЎШАНАВАННЕ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ

8 верасня ў Дзень беларускай вайсковай славы, прысвечаны вялікай перамозе пад Оршай у 1514 годзе, у Кіеве прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы. Ва Успенскім саборы Кіева-Пячэрскай лаўры адбыўся малебен. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі Палка Астрожскага, Палка Каліноўскага, а таксама беларускія вайскоўцы, якія змагаюцца ў складзе УСУ.

Кажа ўдзельнік, каардынатар руху “Каліноўцы” ў Варшаве Дзяніс Герасімчык:

– Гэта было вельмі натхнёна, таму што там сабраліся людзі, якія падтрымліваюць вольную, незалежную Беларусь. Былі намеснік пасла Літвы і пасол Польшчы ва Украіне. Было шмат сцягоў, шмат нашых ваяроў. А потым было ўзнагароджанне хлопцаў. На жаль, многіх пасмяротна.

Гэтыя ўрачыстасці сталі часткай шырэйшых святкаванняў Дня беларускай вайсковай славы, якія прайшлі ва ўсім свеце, дзе жывуць беларусы. Мерапрыемствы падкрэсліваюць пераемнасць гісторыі і сучасную актуальнасць падзей 1514 года, а таксама салідарнасць паміж беларускім і ўкраінскім народамі.

racyja.com

навіны

# ДВОЕ БЕЛАРУСАЎ ПРЭТЭНДУЮЦЬ НА ЛІТОЎСКУЮ ПРЭМІЮ “ГОЛАС ГОДУ”

Галасаванне за кандыдатаў на прэмію ўжо пачалося.

Дэпартамент нацыянальных меншасцяў Літвы праводзіць галасаванні за розныя ініцыятывы года. У катэгорыі “Голас года” на ўзнагароду прэтэндуюць адразу двое беларусаў.

Конкурс арганізавала ініцыятыва Lrytas.lt. Пра мэту конкурсу яна піша:

“Запрашаем падтрымаць ініцыятыву „Шматколернасць Вільні“ і прагаласаваць! Для тых, хто стварае сучасную Вільню – адкрытую, разнастайную, дэмакратычную. Бо разнастайнасць – гэта не пагроза, а магчымасць усім расці разам”.

Сярод кандыдатаў у намінацыі “Голас года” – беларуская паэтка і перакладчыца Ванда Марцінш. Як гаворыцца ў апісанні яе намінацыі, “Ванда чуйна і паслядоўна гаворыць аб правах чалавека, сацыяльную справядлівасць, роўнасць і разнастайнасць у сваёй творчасці, праСоўваючы эмпатыю і ўсведамленне ў грамадстве”.

Ванда Марцінш нарадзілася ў 1959 годзе ў вёсцы Муляры на Пастаўшчыне. У 1980 годзе пераехала ў Вільню пасля заканчэння Віцебскага педагагічнага ўніверсітэта. Таксама жыла ў Шатландыі і Партугаліі. З 2017 году друкуецца ў альманаху “Беларус”, публікавала падборкі вершаў у часопісе “Дзеяслоў” і ў газеце “Літаратура і мастацтва”. Шмат перакладае літоўскіх, польскіх (віленскіх), ангельскіх, гішпанскіх і партугальскіх паэтаў.

Акрамя вершаў на беларускай мове, піша таксама і на літоўскай. У 2024 годзе Марцінш атрымала прэмію мэра Вільні за кнігу вершаў “Маланкі над Вільняй”.


Ванда Марцінш

У спісе таксама журналіст, рэдактар і вядоўца беларускай праграмы “Віленскі сшытак” на Літоўскім тэлебачанні Сяргей Гаўрыленка. Пра яго ў апісанні гаворыцца: “актыўны ўдзельнік беларускай супольнасці ў Літве – за дакументальны тэлевізійны фільм „Апостал Вільні: спадчына Францішка Скарыны”.

Сяргей Гаўрыленка паходзіць з Берасця, у Вільні працуе ўжо больш за 10 гадоў. Акрамя фільму пра Скарыну, ён стаў аўтарам іншых стужак, напрыклад, напісаў сцэнар фільма “Музычны энтузіяст” пра Аліка Мелекса – татарскага дзеяча Літвы.

Беларуса неаднойчы ўзнагароджвалі за плённую працу. Напрыклад, у 2017 годзе ён атрымаў узнагароду Сейму Літвы за “спрыянне міжкультурнаму дыялогу”.

svaboda.org

# ПРАЕКТ БЕЛАРУСКАГА ФАТОГРАФА ПАЎЛА КРЫЧКО ПРА ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У БЕЛАРУСІ ПЕРАМОГ НА КОНКУРСЕ СЛАВЕНСКАГА KRANJ FOTO FEST

“Карта ўспамінаў” – праект Паўла Крычко пра палітычныя ўзрушэнні ў Беларусі стаў уладальнікам Гран-пры на славенскім фотафестывалі ў Крані. Да 27 верасня ў галерэі Stolp Skrlovec у межах Kranj Foto Fest ладзіцца персанальная выстава беларускага аўтара.

Серыя Паўла Крычко была вылучана журы фестывалю сярод больш за паўтары тысячы праектаў з 80 краін, дасланых на конкурс фэсту.

Над сваім цыклам фатограф працуе ўжо некалькі гадоў. Праект можна назваць асабістым, але грунтоўным даследаваннем беларускага палітычнага крызісу ад 2020 года па сённяшні час.

“Замест таго, каб проста захаваць пакуты, Павел Крычко запрашае нас паглыбіцца ў глыбокія, складаныя эмоцыі людзей, дазваляючы гледачу адчуць напружанне палітычнага клімату. Праект прапануе аповед пра барацьбу ўсёй нацыі, асабліва яе маладога пакалення”, – прэзентуе адметнасць працы аўтара фестываль.

Падкрэсліваецца, што праца беларускага фатографа з’яўляецца напамінам пра тое, што цяперашні палітычны момант патрабуе ўвагі і разважанняў.


Павел Крычко на адкрыцці персанальнай выставы ў Stolp Skrlovec у славенскім Кране

“Менавіта спалучэнне актуальнасці, асабістага аповеду і мастацкай смеласці робіць Пашу Крычко вартым гэтага прызнання”, – адзначае журы конкурсу.

Варта дадаць, што сёлета журы вырашыла прысудзіць два Гран-пры адкрытага конкурсу Kranj Foto Fest – яшчэ адным пераможцам спаборніцтва з’яўляецца праект “Прырода рэчаў” венгерскага фатографа Балаж Турош.

Персанальныя выставы Балажа Туроша, і Паўла Крычко можна наведаць у Кране да 27 верасня.

reform.news

навіны

# ФЕСТЫВАЛЬ ІНІЦЫЯТЫВЫ MALDZIS У МУЗЕІ ВОЛЬНАЙ БЕЛАРУСІ

Ініцыятыва "Maldzis" адзначыла год сваёй дзейнасці. З гэтай нагоды яна зладзіла фестываль у Варшаве, які ўключаў дыскусіі і гутаркі, прэзентацыі праектаў і музычную частку.

Адзін са спікераў, кіраўнік Беларускай Рады Культуры Сяргей Будкін распавёў:

– Мне на дыскусіі паставілі пытанне досыць правакацыйнае: як прадаць Беларусь беларусам? І таму, падхапіўшы гэтую правакацыю, вырашыў паразважаць з пункту гледжання бізнесу. У гэтых развагах я прыйшоў да думкі, што прадаваць нічога не трэба, бо мы не з'яўляемся кліентамі, мы ёсць уласнікамі таго брэнду, які мы павінны напаўняць сэнсамі, ідэямі, узмацняць, падтрымліваць, рабіць гэта прывабным, канкурэнтаздольным. Брэнд называецца "Беларусь". Рабіць гэта можна і патрэбна праз культуру, таму што яна з'яўляецца такім рухавіком. І таму ідэя была ў тым, што кожны можа інвеставаць у гэты брэнд, набыўшы нават квіток на канцэрт, дывідэнды атрымліваюць усе.




Івэнт адбыўся ў Музеі Вольнай Беларусі. Сярод выступоўцаў таксама былі Рыгор Астапеня, Павел Мацукевіч, Святлана Курс, Цімох Акудовіч, Наста Роўда і іншыя.

racyja.com

# У ВАРШАВЕ ПРАЦУЕ ШКОЛА ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ЦЭНТРА БЕЛАРУСКАЙ САЛІДАРНАСЦІ

Тут бясплатна можна навучыцца матэматыцы, англійскай мове, мастацтве і не толькі. Падрабязней пра заняткі і выкладчыкаў, новы набор і дадатковыя магчымасці ўстановы – у гутарцы з дырэктаркай Школы Хэлены Нядзьвецкай.

**РР: Чым будзе адметны новы навучальны сезон пры школцы ЦБС?**

**Хэлена Нядзьвецкая:** Хіба такога новага ў нас нічога не будзе, у сэнсе не з'явяцца новыя прадметы, але дзякуй Богу, застаецца ўсё тое, што было ў мінулым годзе. Адзінае, зараз мы набіраем новыя групы дзетак па падрыхтоўцы да экзаменаў у 8 класе – гэта па матэматыцы і ангельскай мове. Бо ў нас дзеткі амаль год вучацца, вось у траўні здавалі экзамены па матэматыцы, у нас было 15 дзяцей, якія займаліся. І дзесьці 12 дзетак з 15 здалі больш чым на 90 балаў. Вельмі высокія паказчыкі. Вельмі задаволены. Па ангельскай таксама дастаткова высокія, больш за 50 ва ўсіх дзетак.




Хэлена Нядзьвецкая

**РР: Раскажыце пра набор.**

**Хэлена Нядзьвецкая:** Зараз будзем толькі абвяшчаць новыя групы, але ёсць ужо бацькі, каторыя загадзя нам пісалі, тэлефанавалі яшчэ ў траўні – чэрвені. Таму мы іх запісвалі ў рэзерв. У нас у тым годзе была толькі адна група дзетак – 15, і ангельская, і польская па падрыхтоўцы. А ў гэтым годзе плануем адкрыць 2–3 групы. І паспрабуем адкрыць адну групу анлайн, каб маглі далучыцца дзеткі з усёй Польшчы, а не толькі з Варшавы.

Заняткі ладзяцца ў будныя і выходныя дні.

Марына Савіцкая, racyja.com

### Беларускі каляндар памятных дат на кастрычнік 2025 года

**1 кастрычніка**
• 60 гадоў таму, у 1965-м, памёр Генрык Бэта, каталіцкі святар, пісьменнік.

**2 кастрычніка**
• 225 гадоў таму, у 1800-м, памёр Мацей Радзівіл, драматург, кампазітар.
• 50 гадоў таму, у 1975-м, памёр Тамаш Падзява, каталіцкі святар-марыянін, філосаф, тэолаг.

**4 кастрычніка**
• 135 гадоў таму, у 1890-м, нарадзіўся Язэп Гладкі, этнограф, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр у 1972-м.

**6 кастрычніка**
• 20 гадоў таму, у 2005-м, памёр Алесь Емяльянаў, паэт, адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту „Адраджэнне".

**7 кастрычніка**
• 125 гадоў таму, у 1900-м, памёр Уладзіслаў Малахоўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**8 кастрычніка**
• 155 гадоў таму, у 1870-м, нарадзіўся Аляксандр Булатовіч, даследчык Усходняй Афрыкі, дыпламат, праваслаўны іераманах. Загінуў у 1919-м.

**18 кастрычніка**
• 65 гадоў таму, у 1960-м, памёр Іван Бялькевіч, мовазнавец.
• 30 гадоў таму, у 1995-м, памёр Янка Макарэвіч, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі, паэт.

**19 кастрычніка**
• 135 гадоў таму, у 1890-м, нарадзіўся Сяргей Палуян, празаік, літаратуразнавец, крытык. Памёр у 1910-м.

**21 кастрычніка**
• 125 гадоў таму, у 1900-м, нарадзіўся Фелікс Купцэвіч, пісьменнік. Расстраляны ў 1938-м.
• 90 гадоў таму, у 1935-м, нарадзіўся Юрка Геніюш, пісьменнік. Памёр у 1985-м.

**25 кастрычніка**
• 30 гадоў таму, у 1995-м, памёр Лявон Случанін (сапр. Лявонцій Шпакоўскі), паэт.

**27 кастрычніка**
• 135 гадоў таму, у 1890-м, нарадзіўся Віктар Шутовіч, каталіцкі святар. Памёр у 1960-м.

**30 кастрычніка**
• 135 гадоў таму, у 1890-м, нарадзіўся Міхаіл Урбановіч, каталіцкі святар у ЗША. Памёр у 1973-м.

**31 кастрычніка**
• 115 гадоў таму, у 1910-м, нарадзіўся Леанід Галяк, юрыст, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр у 1980-м.

**Беларусы ў свеце**
№ 9 (280), верасень 2025
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў
свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар –
Н. Шыдлоўская,
А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com